PolotskSU

УДК 340.11

# ІДЭІ АБ ПРАВЕ, ПАЛІТЫЦЫ, ЗАКАНАДАЎСТВЕ Ў ТВОРЧАСЦІ БЕЛАРУСКІХ МЫСЛІЦЕЛЯЎ XVI СТ.

***Л.Л. Голубева,***
*дацэнт кафедры тэорыі і гісторыі дзяржавы і права, Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт, кандыдат юрыдычных навук, дацэнт*

У 2017 годзе адзначаецца 500-годдзе беларускага кнігадрукавання. Дата мае міравую значнасць і занесена ў каляндар памятных дат ЮНЕСКО. 500-годдзе беларускага кнігадрукавання на працягу гэтага года адзначаюць не толькі па ўсёй Беларусі, але і за мяжой (Расійская Федэрацыя, Рэспубліка Казахстан, Польша, Кітай, Сербія і інш.), дзе таксама праводзяцца міжнародныя канферэнцыі ў гонар гадавіны беларускага і ўсходнеславянскага кнігадрукавання. У сувязі з гэтым цікавасць да разгляду выклікае XVI ст. – стагоддзе, якому належыць пачатак беларускага кнігадрукавання.

XVI ст. – гэта перыяд Вялікага Княства Літоўскага, палітыка-эканамічным цэнтрам якога, як правільна адзначае прафесар Доўнар Т.І., з'яўляліся беларускія землі і для якога характэрны станаўленне нацыянальнай мовы, нацыянальнай самасвядомасці, гуманістычнага светапогляду [1, с. 66]. Прадстаўнікі гэтага часу актыўна выкарыстоўвалі ідэі антычных аўтараў – Платона (428 да н.э.(?) – 348 да н.э.(?)), Арыстоцеля (384 да н.э. – 322 да н.э.), Марка Тулія Цыцэрона (106 да н.э. – 43 да н.э.). У цэнтры ўвагі мысліцеляў знаходзіцца чалавек і яго інтарэсы. Менавіта ў гэты час Ф. Скарына (1490? – 1551?) ўпершыню надрукаваў Біблію. Палітычным ідэалам Ф. Скарыны з'яўляецца асветная, гуманная, моцная манархія. На яго думку манарх павінен быць набожным, мудрым, адукаваным, чулым, справядлівым да сваіх падданых. Ён абавязаны кіраваць дзяржавай у строгай адпаведнасці з законамі, сачыць за справядлівым выкананнем правасуддзя. Адначасова ён павінен быць моцным і грозным, умець у неабходным выпадку абараніць свой народ. Перавагу Ф. Скарына аддаваў адукаванаму і міралюбіваму кіраўніку дзяржавы [2, с. 389 – 398]. Такія ж палітычныя погляды і ў знакамітага прадстаўніка палітыка-прававой думкі Беларусі XVI ст. С. Буднага (каля 1530 – 1593). У прадмове да кнігі “Другі закон Маісееў” Ф. Скарына прапанаваў класіфікацыю права, якое, на яго погляд, дзеліцца на натуральнае і пісанае. Натуральнае права закладзена ў самой істоце чалавека, яно аднолькавае для ўсіх людзей, уласціва кожнаму чалавеку і не залежыць ад звычаяў, часу і месца. Пісанае права ён падзяляў на боскае, царкоўнае (кананічнае) і земскае. Нормы Боскага права змешчаны ў кнігах Старога і Новага Запавету (Бібліі). У гэтай кнізе змешчаны ўсе законы і правы, якімі людзі павінны кіравацца на зямлі. Гэтыя нормы з'яўляюцца сінонімамі волі бога. Таму заслугоўвае асуджэння не толькі той, хто не падпарадкоўваецца волі бога, але і той, хто не ведае яе прадпісанняў. Царкоўнае (кананічнае) права – гэта пастановы (каноны), прынятыя царкоўнай уладай. У земскім праве ў залежнасці ад грамадскіх адносін, што рэгуляваліся пэўнымі нормамі, Ф. Скарына вылучаў: паспалітае права

PolotskSU

(уключала ў сябе нормы грамадзянскага і сямейнага права), міжнароднае, дзяржаўнае, крымінальнае, ваеннае, гарадское, марское, гандлёвае права. Ф. Скарына лічыў, што пісаны закон павінен быць годным для выканання, карысным для насельніцтва і павінен адпавядаць звычаям, часу і месцу [3, с. 55 – 60].

Супастаўленне прававых ідэй Ф. Скарыны са зместам Статута ВКЛ 1529 г. дазволіла асобным даследчыкам (прафесару Юхо Я.А.) прыйсці да высновы, што Ф. Скарына ўдзельнічаў у распрацоўцы першага сістэматызаванага зводу законаў дзяржавы і прапанаваная ім класіфікацыя права была выкарыстана пры падрыхтоўцы Статута ВКЛ 1529 г. [4, с. 204]. На нашу думку, менавіта вылучэнне ў земскім праве вышэй названых галін права, і было пакладзена ў аснову сістэматызацыя нормаў права першага зводу законаў дзяржавы. Выказваўся Ф. Скарына і па адным з найбольш важных пытанняў крымінальнага права – аб мэце пакарання. Мэта крымінальнага пакарання – гэта застрашванне злачынцы і адначасова папярэджанне іншым асобам, здольным да злачынства. На думку асветніка закон павінен быць прыгодным для выканання, карысным для насельніцтва і павінен адпавядаць звычаям, часу і месцу. Цікавы той факт, што Ф. Скарына быў не толькі вучоным-прававедам, але і юрыстам-практыкам. Ён неаднаразова выступаў у судах у якасці абаронцы асабістых інтарэсаў, а таксама інтарэсаў сваіх блізкіх (брата Івана і жонкі Маргарыты).

Знакамітым гуманістам XVI ст. з’яўляецца М. Літвін. У сацыяльна-палітычным трактаце “Аб норавах татар, літоўцаў і масквіцян” (выдадзены ў 1615 г. на лацінскай мове) аўтар узняў пытанні сацыяльна-палітычнага ўдасканалення грамадства, рэфармавання існуючых грамадскіх інстытутаў. Аснову гарманічнага грамадства бачыў у маёмаснай роўнасці, прытрымліваўся канцэпцыі ідэальнага правіцеля, справядлівага кіравання і правасуддзя. Грамадскія праблемы разглядаў з пазіцый процівастаўлення дрэнных і добрых звычаяў. Так, імкненням да багацця і раскошы процівастаўляў самаабмежаванне, памяркоўсць. Выступаў супраць заняволення адных людзей другімі. М. Літвін закрануў праблему сацыяльнай роўнасці перад законам. На яго думку павінен быў быць аднолькавы прынцып абкладання падаткамі простага чалавека і шляхціча: чым большая маемасць, тым большым павінен быць падатак. Адлюстраваў погляды тых, хто кіраваўся ў сваёй дзейнасці нацыянальнымі інтарэсамі ВКЛ Шмат месца ў трактаце адведзена пытанням удасканалення правасуддзя. Мысліцель прапаноўваў права на вынясенне смяротнай кары дазволіць толькі вышэйшым судам, а таксама ўвесці агульнасаслоўныя суды. У трактаце М. Літвін вылучыў недахопы судовай сістэмы: адсутнасць апеляцыйных судоў; адсутнасць галоснасці; хібы ў сістэме паказанняў сведак; адсутнасць нормаў судовай пісьменнасці. Ён падкрэсліваў, што сістэма непадзельнасці судовай і адміністрацыйнай улад, сумяшчэнне адной асобай некалькіх адміністрацыйных пасад вядуць да страты самой ідэі справядлівасці і незалежнасці суда [5, с. 46 – 48]. Праблемы, узнятыя М. Літвінам у трактаце, часткова былі вырашаны ў час судовай рэформы 1564 г.: удасканалена дзяржаўнае кіраванне і правасуддзе, удасканалена працэдура судовага разбору, створана апеляцыйная судовая інстанцыя, падрыхтаваны кваліфікаваныя ўраднікі дзяржаўнага кіравання і суда [6, с. 179 – 187].

PolotskSU

Вядомы гуманіст М. Гусоўскі (каля 1480 – 1533) у творы "Песня пра постаць, дзікасць зубра і паляванне на яго" (1522) заклікаў да яднання і дружбы розных на веры і культуры еўрапейскіх народаў перад пагрозай турэцкага і татарскага нашэсця, услаўляў свабодную, гарманічна развітую і мужную асобу. М. Гусоўскі першым убачыў і адлюстраваў пачатак крызісу сацыяльна-палітычнага ладу ВКЛ. У войнах М. Гусоўскі бачыў адну з найважнейшых прычын няшчасцяў чалавецтва, пакут радзімы і народа. Ён заклікаў спыніць міжусобіцы. Паказаў жыццё мужных, працавітых людзей, іх побыт і звычаі, ідэалізаваў вобраз вялікага князя Вітаўта [7].

Ідэолагі рэфармацыйнага руху лічылі, што для выратавання душы веруючага не патрабуецца ўдзелу каталіцкай царквы, таму што выратаванне адбываецца не добрымі справамі, а ўнутранай верай. Прадстаўнікі рэфармацыйнага руху ў ВКЛ адмаўлялі неабходнасць існавання Рымскай Каталіцкай царквы, каталіцкага духавенства як асобнага сацыяльнага слоя, які згодна з вучэннем царквы надае чалавеку Божую ласку. Адзінай крыніцай веры ідэолагі Рэфармацыі лічылі Свяшчэннае Пісанне і адмаўлялі значэнне Свяшчэннага Падання. У другой чвэрці XVI ст. рэфармацыйныя ідэі пачынаюць распаўсюджвацца на тэрыторыі ВКЛ. Рэфармацыйны рух праявіўся ў ВКЛ пераважна ў формах лютэранства, кальвінізму і арыянства [8].

А. Волан (1530 – 1610), як вядомы прадстаўнік кальвінісцкага руху ў ВКЛ, выступаў за рэформы ў сацыяльных і палітычных адносінах, праве і дзяржаўным кіраванні, распрацаваў канцэпцыю свабоды чалавека. У працы "Пра гасудара і ўласцівыя яму дабрачыннасці" аналізаваў тыя рысы, якімі павінен валодаць сапраўдны кіраўнік дзяржавы. Права, на думку А. Волана, павінна быць справядлівым, выступаць гарантам свабоды і роўнасці, быць разумным. Яно павінна стаяць на варце ўсеагульнай справядлівасці. Адзначаў аб неабходнасці пастаяннага ўдасканалення заканадаўства, аб развіцці прававой навукі, аб высокіх маральных якасцях пры выбарах і прызначэнні суддзяў і службовых асоб. Прытрымліваўся тэорыі натуральнага права і выкарыстоўваў для яе характарыстыкі раннехрысціянскі маральны прынцып "І гэтак ва ўсім, як хочаце, каб з вамі абыходзіліся людзі, так і вы абыходзьцеся з імі" [9; 10].

Прадстаўнік правай (памяркоўнай) плыні арыянства С. Будны пераклаў на беларускую мову прадмову да "Катэхізісу" і распрацаваў у ёй вучэнне пра войны справядлівыя і несправядлівыя. На яго думку справядлівыя войны вядуцца дзеля абароны Айчыны і сапраўдны хрысціянін павінен прымаць удзел у такой вайне. Несправядлівыя войны асветнік называе "разбоем". Абавязак кожнага сумленнага чалавека не ўдзельнічаць у такой вайне. На старонках галоўнай працы свайго жыцця "Аб свецкай уладзе" С. Будны адзначаў, што сапраўдны арыянін можа займаць дзяржаўныя пасады, звяртацца ў суд, весці судовыя працэсы, і нават выконваць абавязкі суддзі. С. Будны лічыў, што суддзя павінен быць справядлівым, чэсным, праўдзівым, веруючым; павінен судзіць справядліва, не перакручваць законы і не браць хабару [2, с. 69 – 76].

На думку вядомага дзяржаўнага дзеяча Л. Сапегі (1557 – 1633) цэнтральнай катэгорыяй філасофіі права з'яўляецца катэгорыя свабоды. "Мудрацы ўсіх

PolotskSU

вякоў лічылі, што ў кожнай дзяржаве прыстойнаму чалавеку не можа быць нічога даражэй за свабоду” – такімі словамі пачынае мысліцель“Зварот” да ўсіх саслоўяў ВКЛ. Права ўласнасці і права асабістай недатыкальнасці складаюць сутнасць свабоды. Права Л. Сапега разглядаў як сапраўднае праяўленне розуму чалавека. Права павінна забяспечыць дзяржаве ўнутраны парадак, стабільнае і ўстойлівае развіццё, сацыяльны мір. Толькі павага да права дае магчымасць быць сапраўды свабоднымі. Кожны чалавек павінен ведаць межы сваей свабоды, а для гэтага неабходна вывучаць законы. Закон павінен быць аднолькавым і абавязковым для ўсіх саслоўяў. Разам з тым, ён павінен быць накіраваны супраць асобных правапарушальнікаў. Калі ў грамадстве адсутнічае павага да права, пануе беззаконнасць, яно не можа лічыцца чалавечым і справядлівым. Такое грамадства асветнік называе “воўчай зграяй”. Права, на яго думку, павінна не дапусціць выкарыстання дзяржаўнай улады ў карыслівых мэтах правіцеля. Усе думкі Л. Сапегі даюць магчымасць разглядаць яго як прыхільніка ідэі прававой дзяржавы [8].

Такім чынам, прааналізаваўшы погляды некаторых беларускіх мысліцеляў XVI ст. на палітыку, права, заканадаўства, можна сцвярджаць, што яны ў многім апярджвалі свой час. Прычым, гэтыя думкі былі сугучны з сучаснымі ідэямі…

***Спіс выкарыстаных крыніц:***


1. Доўнар, Т.І. Гісторыя дзяржавы і права Беларусі / Т.І. Доўнар. – Мінск: ДІКСТ БДУ, 2011. – 552 с.
2. Асветнікі зямлі Беларускай: Энцыкл. Даведнік / Рэдкал.: Г.П. Пашкоў і інш. – Мінск: БелЭн, 2001. – 496 с.
3. Шалькевіч, В.Ф. Гісторыя палітычнай і прававой думкі Беларусі / В.Ф. Шалькевіч. – Мінск: Маладзежнае навуковае суполніцтва, 2002. – 248 с.
4. Юхо, Я.А. Гісторыя дзяржавы і права Беларусі: у 2 ч. / Я.А. Юхо. – Мінск: РІВШ БДУ, 2000. – Ч. 1. – 352 с.
5. Вішнеўская, І.У. Гісторыя палітычнай і прававой думкі Беларусі / І.У. Вішнеўская. – Мінск: Тэсей, 2004. — 271 с.
6. Гісторыя і сучаснасць: беларуская дзяржаўнасць ва ўсходнееўрапейскім кантэксце: зборнік навуковых прац, прысвечаных 90-годдзю з дня нараджэння прафесара І.А. Юхо / рэдкал.: С.А. Балашэнка (гал. рэд.) і [інш.]. – Мінск: Бизнесофсет, 2012. – 552 с.
7. Сокол, С.Ф. Политическая и правовая мысль в Белоруссии XVI – первой половины XVII в. / С.Ф. Сокол. – Минск: Наука и техника, 1984. — 186 с.
8. Голубева, Л.Л. Гісторыя палітычнай і прававой думкі Беларусі: вучэб. метад. комплекс / Л.Л. Голубева. – Мінск: ГИУСТ БГУ, 2005. – 84 с.
9. Доўнар, Т.І. Андрэй Волан (Валян) – беларускі філосаф і правазнаўца XVI стагоддзя // Юстыцыя Беларусі. 2012, № 8. – С. 75 – 77.
10. Доўнар, Т.І. Гісторыя палітычнай і прававой думкі Беларусі XVI – XVIII ст.: хрэстаматыя / Т.І. Доўнар, Ю.П. Доўнар, Л.Л. Голубева. – Мінск: БДУ, 2004. — 206 с.